Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 САКАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 48 (27906) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Каб «Ветразь» быў надзейным

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Кіроўца з грамадзянскай пазіцыяй

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя:**

*«Пацыент мае права выбару айчынных або імпартных лекавых сродкаў. У аптэках ёсць і будзе забяспечаны поўны асартымент лекавых сродкаў як нашай, так і імпартнай вытворчасці. Ніякіх абмежаванняў у дачыненні да лекаў няма. Кожны фармацэўтычны работнік павінен даносіць да чалавека, які прыходзіць у аптэку, што ў наяўнасці ёсць як айчынныя лекі па той ці іншай цане, так і імпартныя. Пры гэтым айчынныя прэпараты па ўсіх параметрах ідэнтычныя імпартным і значна таннейшыя. Сярэдняя цана айчыннай упакоўкі — $1,36, у той час як імпартная каштуе $4,72. Кошт беларускіх лекавых сродкаў не змяняецца, калі ў іх няма імпартнага складніка».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15070,00 | ▼ |
| Еўра | 15970,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 246,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 692,87 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Нашчадкі вогненных вёсак

# Перазімавалі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цёзак па прозвішчы Марыю Лук'янаўну і Валянціну Парфёнаўну СІПЛІВЫХ з вёскі Залессе Пружанскага раёна я здымаў роўна год таму — ранняй вясной. У суседак шмат агульнага: абедзве застаюцца зімаваць у родных хатах, хоць сваякі і клічуць у горад, дапамагаюць адна адной, калі каторая заняможа. А яшчэ ў іх агульная памяць — пра тое, як фашысты палілі роднае Залессе, як усіх жыхароў фактычна выгналі з вёскі, дазволіўшы забраць толькі самае неабходнае. Як пасля вайны адбудоўваліся на папялішчах...

Учора пазваніў гаспадару аграсядзібы каля Залесся, спытаў, як там Марыя з Валянцінай. «Нічога, перазімавалі», — пачуў у адказ. Прыгрэе сонейка, сядуць суседкі на лаўку, пакладуць на калені спрацаваныя за гады рукі і зацягнуць сваю любімую: «Вы не вейцеся, русыя кудры...»

■ Спецыяльны рэпартаж

# ВЫЕЗД У СВЕТ

**У будні сацыяльнае таксі замаўляюць, каб з'ездзіць у паліклініку, а на выхадныя — у царкву ці на конную тэрапію**

**Ці часта вы бачыце на вуліцы інвалідаў-калясачнікаў ці тых, хто страціў зрок? Прынамсі я вельмі рэдка. І не таму, што такіх людзей няма. Толькі ў Мінску жыве каля 120 тысяч інвалідаў. Аднак большасць з іх не выходзяць з кватэры. Людзям з асаблівасцямі ў развіцці складана выбрацца за межы двара, не кажучы ўжо пра паездку ў парк ці на канцэрт. Каб палегчыць інвалідам шлях, які ім самастойна пераадолець цяжка, а то і немагчыма, у сталіцы ўжо пяты год працуе сацыяльнае таксі. Сёлета дыспетчары мінскіх тэрытарыяльных цэнтраў сацабслугоўвання насельніцтва прынялі больш за 66 тысяч заявак. Каб даведацца, наколькі такая паслуга палягчае інвалідам жыццё і з якімі праблемамі яны сутыкаюцца ў горадзе, карэспандэнты «Звязды» ў адзін з будных дзён далучыліся да рэйса сацыяльнага таксі Фрунзенскага раёна.**

## ПАСТАЯННЫЯ ПАСАЖЫРЫ

З кіроўцам Юрыем ПЯТРОВІЧАМ мы сустракаемся ў 8.45 раніцы ля эндакрыналагічнага дыспансера. Праз некалькі хвілін падыходзяць пасажыры — маладая жанчына, інвалід па зроку, і яе маці. Эма Антонаўна клапатліва дапамагае дачцэ забрацца ў машыну. Расказвае, што ездзілі здаваць аналізы, на наступным тыдні трэба да эндакрынолага на прыём. Сацыяльным таксі сям'я карыстаецца даўно, напэўна, з таго моманту, як яно з'явілася.

— Без машыны было б вельмі складана, — прызнаецца Эма Антонаўна. — Дабрацца кудысьці грамадскім транспартам немагчыма. У метро — натоўп народу, саб'юць з ног і не заўважаць. Ды і не ўсе, напэўна, разумеюць, што чалавек у цёмных акулярах — сляпы.

СТАР. 13



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У Фрунзенскім раёне працуюць тры машыны сацыяльных таксі: дзве з пад'ёмнікамі і адна сямімесная.

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# Першы крок

## Да дарослага жыцця і адказнасці перад сваёй краінай

**Маладым жыхарам горада Баранавічы ў Авальнай зале парламента ўрачыста ўручыў пашпарты старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**



Фота БЕЛТА.

Парламентарый падкрэсліў, што гэты дакумент — першы крок у самастойнае жыццё кожнага з прысутных. «Вы сталі паўнапраўнымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, і, вядома, гэта накладае пэўную адказнасць, абавязкі. Варта дакладна разумець, што ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі вы адказныя за лёс нашай краіны», — звярнуўся да хлопцаў ды дзяўчат дэпутат.

«У Беларусі створаны ўсе ўмовы для атрымання годнай адукацыі. Каля 5% бюджэту штогод накіроўваецца на развіццё адукацыйнай сферы», — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў, кажучы пра напрамкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Уладзімір Андрэйчанка таксама нагадаў, што 2015-ы ў Беларусі аб'яўлены Годам моладзі. Гэта зроблена для таго, каб чарговы раз прыцягнуць увагу дзяржавы да праблем у гэтай сферы. Акрамя пашпартоў, маладыя людзі атрымалі членскія білеты грамадскай арганізацыі «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Сустрэча адбылася ў межах акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!».

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■ Блізкая ўлада

# ЛЮДЗЕЙ ЦІКАВЯЦЬ НЮАНСЫ...

**На чарговую «прамую лінію» ў Бешанковіцкі райвыканкам звярнуліся людзі, якіх хвалявалі праблемы, бадай, тыповыя для глыбінкі.**

Некаторыя з іх ужо вырашыліся.

— Выслухаў сем чалавек. Гэта параўнальна многа, калі лічыць, што раней на «прамыя лініі» звярталіся два або тры грамадзяніны. Пара зваротаў тычылася тыповага веснавога пытання: растаў снег, праблематычна пад'ехаць да населенага пункта. У панядзелак праблемныя ўчасткі дарог прывялі ў парадак. А зімой было шмат пытанняў наконт асвятлення... Пачынаецца вясна, і думаю, у далейшым будуць задавацца пытанні камунальнага характару, добраўпарадкавання тэрыторыі. Дарэчы, не за гарамі Радаўніца. І, упэўнены, зноў жа традыцыйна будуць агучаны праблемы па пад'ездах да могілак. Так, апошнія перадалі на баланс камунальнікам. А калі могілкі знаходзяцца сярод поля, што рабіць? Стараемся тлумачыць людзям, што на землях сельскагаспадарчага прызначэння аўтамабільную дарогу не пабудуеш. Але ад праблемы, як кажуць, не адмахваемся. І імкнёмся лакальны рамонт такіх дарог правесці: падсыпаць, каб дайсці можна было, — распавядае



Фота БЕЛТА.

**Сяргей АКУНЕВІЧ, першы намеснік старшыні Бешанковіцкага райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Паводле яго слоў, людзі на гэты раз не агучвалі пытанні па актуальнай для многіх на сённяшні тэме — прыватызацыі жылля. А раней адзінкавыя звароты былі накіраваныя да ўлады ў пісьмовым выглядзе. Спрэчныя моманты высвятляюцца...

— З усіх зададзеных можна вылучыць пытанне наконт прыватных свіней. Памятаеце ж, афрыканская чума «прайшла» года паўтара таму? Зноў пасля рамонту засяляем комплекс на 24 тысячы галоў. Дык людзі і цікавяцца нюансамі дазволу і забароны на ўтрыманне свіней у населеных пунктах. Тлумачальную работу і раней праводзілі... Кансультацыйным можна лічыць зварот чалавека наконт водазабеспячэння шматпавярховага дома. У апошнім цалкам памянялі так званую «разводку». Трэба ў найбліжэйшы час усё неабходнае дарабіць да канца, каб ваду падвесці, — працягвае Сяргей Акуневіч.

Суразмоўца канстатаваў, што сёлетняя «прамыя лініі» ў раёне — не кампанейшчына.

— Можа яшчэ і таму не было зваротаў, якія, як вы кажыце, здзівілі. Мы і раней знаходзіліся на «лініі» з землякамі: два разы на месяц — бліжэй да канца працоўнага дня. Я і мае калегі да такой практыкі звыклыя. Вельмі плённа штомесяц праходзяць і выязныя Дні сельсаветаў. Падчас апошніх у вёсках з удзелам старшынь сельскага Савета, прадстаўнікоў раённых службаў выслухоўваюцца праблемы, робіцца захады, каб іх вырашыць, — дадаў Сяргей Генадзевіч.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Да ведама

## УЛАДЫ АДКАЗВАЮЦЬ НА ПЫТАННІ ЖЫХАРОЎ КРАІНЫ

### Прамыя тэлефонныя лініі працягваюцца

*У Беларусі сёлета арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній у мэтах павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для неадкладнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей. Такія «прамыя лініі» стартавалі 17 студзеня і праводзяцца кожную суботу.*

На сувязь з жыхарамі рэгіёнаў **14 сакавіка з 9.00 да 12.00** выйдуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
ЛІС Анатоль Васільевіч — старшыня: 80162213121

**Віцебскі аблвыканкам**
МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч — намеснік старшыні: 80212204260

**Гомельскі аблвыканкам**
ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч — намеснік старшыні: 80232751237

**Гродзенскі аблвыканкам**
КРАЎЦОЎ Уладзімір Васільевіч — старшыня: 80152735644

**Мінскі аблвыканкам**
МАКАР Ігар Мікалаевіч — першы намеснік старшыні: 80175004160

**Магілёўскі аблвыканкам**
ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч — старшыня: 80222501869

**Мінскі гарвыканкам**
БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна — намеснік старшыні: 8017222 44 44.

# ЧАС СЕЯЦЬ

**На Брэстчыне пачалася сяўба яравых збожжавых культур. Першымі на палеткі выйшлі земляробы Кобрынскага, Драгічынскага, Камянецкага, Бярозаўскага, Маларыцкага раёнаў. У гаспадарках рэгіёна засеяны першыя дзве тысячы гектараў.**

Як паведамілі ў аблсельгасхарчы, у вобласці пад яравыя адведзена сёлета 425,8 тысячы гектараў. Пачатак сяўбы па тэрмінах практычна супаў з мінулагоднім. А летась, як вядома, атрымалі нядрэнны ўраджай. Так што, паводле ацэнкі спецыялістаў, трэба спяшацца, каб не прапусціць аптымальныя тэрміны.

**Яна СВЕТАВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## КУПІЛІ 50 КГ ЗОЛАТА

**Нацыянальны банк прадаў за першыя два месяцы 2015 года больш за 50 кг золата ў злітках. Назад выкуплена толькі каля 11 кг.**

Статыстычныя звесткі Нацбанка сведчаць, што за студзень і люты рэалізавана 4 тысячы 487 залатых злітак. Найбольшым попытам у беларусаў карысталіся 5-, 10- і 20-грамовыя. Выкуплена ў насельніцтва — 442 залатыя зліткі. Серабро таксама было папулярным — амаль 18,6 кг (463 зліткі), выкуплена назад крыху больш за 10 кг (58 зліткаў). А вось плаціну беларусы не асабліва паважаюць: купілі 69 г, а прадалі назад Нацбанку — 321 г. У злітках гэта 17 і 18 штук адпаведна.

Дарэчы, цэны на мерныя зліткі, устаноўленыя на 10 сакавіка 2015 года, выглядаюць так (купля/продаж): 1г золата — 568 100 руб./762 450 руб.; 10 г серабра — 74 750 руб./224 250 руб.; 1 г плаціны — 553 150 руб./822 250 руб.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## У ЛЯСЫ ЎЖО НЕЛЬГА

**Сёлетнія веснавыя ўмовы надвор'я прымушаюць рабіць некаторыя крокі раней, чым звычайна. Так, у мэтах папярэджання пажаранебяспечных сітуацый Лунінецкі раённы выканаўчы камітэт ужо прыняў рашэнне аб забароне наведвання лясоў і поймы Прыпяці насельніцтвам.**

Забаронены і ўезд на іх тэрыторыю транспартных сродкаў без дазволу органаў лясной гаспадаркі — да адпаведнага распараджэння. Выключэнне складаюць работнікі і транспарт Лунінецкага лягаса, раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях і ўнутраных спраў, інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Мікашэвіцкай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры выкананні сваіх службовых абавязкаў. Забараняецца таксама спальваць сухую расліннасць, праводзіць сельскагаспадарчыя выпальванні, разводзіць вогнішчы на прысядзібных участках і ў межах населеных пунктаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАХАННЕ БЕЗ МЕЖАЎ

**Даволі рамантычную версію свайго ўчынку паведаміў парушальнік, якога лідскія памежнікі неўзабаве пасля жаночага свята затрымалі дзякуючы спрацаваўшай сігналізацыі.**

У выніку праваахоўнікі выявілі дарожку слядоў з Літвы ў Беларусь і за 500 метраў ад мяжы затрымалі 25-гадовага жыхара горада Шальчынінкай. Хлопец патлумачыў, што парушыў мяжу дзеля сустрэчы са сваёй беларускай сяброўкай. Маючы пры сабе 10 еўра, ён збіраўся «злавіць» машыну і прыехаць да каханай у Гродна. Праўда, гэтая версія азмрочваецца тым, што малады чалавек быў нападпітку. І, да таго ж, тры гады таму за спробу парушэння дзяржмяжы яго ўжо прыцягвалі да адказнасці. Цяпер хлопцу пагражае дэпартацыя з забаронай уезду ў нашу краіну тэрмінам на 5 гадоў, як паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## І ВАЛЮТА БЫВАЕ «КУСЛІВАЙ»

**Падатковая дэкларацыя выявіла перавышэнне расходаў над даходамі прадпрымальніка на суму 267,7 млн рублёў**

Пашыраныя паўнамоцтвы падатковай галіны пачынаюць даваць свой плён. Вось і інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці атрымала канкрэтныя звесткі банкаўскіх устаноў аб набыцці мясцовым жыхаром замежнай валюты на даволі значную суму. Таму ў грамадзяніна была запатрабавана дэкларацыя аб даходах і маёмасці. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.

Падчас праверкі дэкларацыі аб даходах і маёмасці ўстаноўлена перавышэнне расходаў над даходамі ў суме 33,6 млн рублёў. Аднак пытанні да кліента ў кантралёраў засталіся, бо наш суайчыннік адной з крыніц даходаў паказаў дагавор пазыкі з грамадзянінам Расіі ў суме 32 тысячы еўра. Таму інспекцыя зрабіла запыт у падатковы орган Расійскай Федэрацыі аб пацвярджэнні дакладнасці гэтага дагавора. А факт атрымання пазыкі не пацвердзіўся.

Потым, згодна з вынікамі ўдакладненага разліку, сума пазыкі была выключана з даходу, названага ў дэкларацыі, а перавышэнне расходаў над даходамі склала 267,7 млн рублёў. У выніку грамадзяніну прад'яўлены да даплаты падаходны падатак у суме 32,1 млн рублёў, які цалкам паступіў у бюджэт. Акрамя таго, парушальніку пагражае адміністрацыйны штраф за ўказанне недакладных звестак у дэкларацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Далучайся!

# Чытанне... навобмацак

**Навуковая бібліятэка БНТУ, праект «ЗаЧытанне» і праграма «Мівія» запусцілі ўнікальны для Беларусі дабрачынны праект па стварэнні тактыльных копій сучасных дзіцячых кніг для дзяцей-інвалідаў па зроку — «Тактыльныя кнігі». Падобныя методыкі інклюзіўнага навучання на аснове працы з кнігай у Беларусі яшчэ не практыкаваліся.**

У рабоце зараз знаходзіцца тактыльная копія кніжкі-карцінкі «Гісторыя пра маленькага труса» Каці Талстой. Гэта вельмі добрая філасофская дзіцячая кніжка, карцінкі ў якой складаюць такую ж важную частку гісторыі, як і тэкст.

Перад запускам праекта быў вывучаны расійскі і замежны досвед, атрыманы дазвол расійскага выдавецтва, адабраны фактурныя тканіны для таго, каб паўтарыць кніжныя ілюстрацыі ў выглядзе тактыльных аплікацый.

Майстар робіць загатоўкі аднаго развароту кнігі, а на сустрэчы праводзіць для добраахвотнікаў майстар-клас па яго пашыўцы. Такім чынам цягам пяці заняткаў адным удзельнікам поўнасцю паўтараецца адна кніга. У праекце задзейнічаны дзеці і бацькі, якія сумеснымі намаганнямі ствараюць кнігі для дзетак са слабым зрокам. Далучыцца могуць усе ахвотныя. Першыя дзве сустрэчы ўжо прайшлі. Наступныя адбудуцца 14, 28 сакавіка і 11 красавіка ў Навуковай бібліятэцы БНТУ (вуліца Якуба Коласа, 16, у 11 гадзін).

14 сакавіка на сустрэчы будзе прысутнічаць эксперт — інвалід па зроку, які пратэсціруе ўжо пашытыя старонкі кнігі, дасць парады і правядзе майстар-клас па напісанні шрыфтам Брайля.

Па выніках усіх майстар-класаў плануюць выпусціць відэаінструкцыю па вытворчасці тактыльных кніг, якая будзе даступная ў інтэрнэце для ўсіх ахвотных.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Сезон

# ДЗІЧЫНА ЧАКАЕ.
## Але на Гайне павінна быць спакойна

**З 14 сакавіка па 10 мая ў краіне будзе дазволены сезон палявання на гусей (белалобых, гуменнікаў, шэрых) і канадскую казарку.**



— Здабываць дазваляецца птушак любога полу і ўзросту зброевым спосабам з засады і толькі са схованкі. Зброя — гладкаствольная паляўнічая стрэльбы з патронамі са шротам. Для пошуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак. Паляванне на пералічаныя віды дазволена толькі ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін, — распавёў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей.

Аднак трэба памятаць, што, згодна з пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ад 1 ліпеня 2014 года №30, устаноўлена забарона на паляванне на гусей белалобых, гуменнікаў, шэрых, канадскіх казарак, крыжанак, чыркоў-траскункоў, чыркоў-свістункоў, чэрнець чырвонагаловую, чэрнець чубатую ў паляўнічых угоддзях у веснавы сезон палявання па зацверджаным пераліку. Напрыклад, на тэрыторыі Мінскай вобласці забаронена паляванне ў Барысаўскім раёне ў паляўнічых угоддзях на пэўных участках Бярэзіны і Гайны і прылеглых да іх тэрыторыях. Таму, выпраўляючыся на прыроду са стрэльбай, трэба ўдакладніць, у якіх дакладна месцах страляць па дзічыне нельга нават падчас сезона палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Надвор'е

## Уначы яшчэ замаразкі, аднак удзень — ужо вясна

**Сёння пад уплывам атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з боку Украіны, у цэнтральных і паўднёвых раёнах краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе не больш за 2-7 цяпла. І ў выхадныя тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам малаunion... 

Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе не больш за 2-7 цяпла. І ў выхадныя тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам малаградыентнага поля, якое пачне паступова губляць сваю моц. У суботу часам будзе ісці дождж і мокры снег. Тэмпература паветра ўначы на суботу будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — плюс 2-7. Ужо ў нядзелю атмасферны ціск пачне павялічвацца і непрацяглыя ападкі ў выглядзе дажджу (уначы — дождж і мокры снег) чакаюцца толькі месцамі. Уначы ў асобных раёнах галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — ад 4 да 10 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня наша краіна апынецца на ўскрайку антыцыклону. Таму ў панядзелак ападкаў увогуле не будзе. Раніцай у асобных раёнах слабы туман. У гэтыя дні надвор'е будзе мець больш кантынентальны характар з вялікімі дыяпазонамі сутачных тэмператур. З панядзелка па сераду тэмпература паветра ўначы будзе складаць ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, а ўдзень чакаецца ўжо ад 3 да 10 цяпла, а месцамі і да плюс 12 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон і з'яўляецца тыповым сакавіцкім надвор'ем.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

■ Фінансы

# ПРЫВАТНЫ БАНК ТРАПІЎ ПАД РЭЖЫМ «РУЧНОГА» КІРАВАННЯ

**Пастановай праўлення Нацыянальнага банка Беларусі прынята рашэнне аб увядзенні з 12 сакавіка ў акцыянерным таварыстве «Дэльта Банк» часовай адміністрацыі па кіраванні банкам, паведамляе прэс-служба Нацбанка.**

Паўнамоцтвы праўлення гэтай фінансавай установы на перыяд дзеяння часовай адміністрацыі па кіраванні банкам прыпынены. Кіраўніком часовай адміністрацыі па кіраванні ЗАТ «Дэльта Банк» прызначаны Аляксандр Пядзько. Яму даручана прыняць функцыі выканаўчага органа банка і сфарміраваць склад часовай адміністрацыі ў вызначаным парадку.

Галоўны фінансавы рэгулятар краіны тлумачыць, што гэтая мера прынята на падставе аналізу паказчыкаў бягучай дзейнасці беларускага таварыства «Дэльта Банк» на фоне негатыўных падзей, якія адбываюцца ў аднайменным замежным банку (Украіна), у тым ліку звязаных з прызнаннем яго неплацежаздольным.

«Увядзенне часовай адміністрацыі ў ЗАТ «Дэльта Банк» накіравана на зніжэнне рызык фарміравання перадумоў для стварэння становішча, якое пагражае інтарэсам укладчыкаў і іншых крэдытораў гэтага беларускага банка», — адзначылі ў Нацбанку.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# ЯК ЖЫВУЦЬ СУВОРАЎЦЫ?

Пра гэта можна даведацца непасрэдна на месцы — **Мінскае суворavoid**

Пра гэта можна даведацца непасрэдна на месцы — **Мінскае сувораўскае ваеннае вучылішча запрашае на Дзень адчыненых дзвярэй,** якія адбудзецца **21 сакавіка.** У наведвальнікаў з'явіцца магчымасць не толькі сустрэцца з камандаваннем вучылішча, а і пазнаёміцца з умовамі жыцця і побыту суворацаў, убачыць вучэбна-матэрыяльную базу ўстановы, даведацца пра асаблівасці паступлення ў вучылішча сёлета. Усіх ахвотных чакаюць у 10.00 па адрасе: г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 29. Тэлефон для даведак: 8 (017) 297 29 00.

■ На кантролі

# НЯМА 18-ці — У КЛУБЕ НЕ МЕСЦА

**Пракуратура Мінска прапануе арганізаваць маніторынг начных клубаў на прадмет допуску ў іх непаўналетніх. Пра гэта паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Сяргей БАЛАШАЎ.**

У пракуратуры лічаць недастатковай працу органаў унутраных спраў па выяўленні парушэнняў, звязаных з допускам у пэўныя забаўляльныя ўстановы непаўналетніх. Таму будуць праведзены маніторынгі, якія пакажуць, як адміністрацыі клубаў і дыскатэк кантралююць прапускны рэжым наведвальнікаў.

«Механізм праваздзення маніторынгаў яшчэ распрацоўваецца. Але ніякіх аблаў і рэйдаў не будзе, проста будуць хадзіць правяраючыя», — распавёў «Звяздзе» Сяргей Балашаў.

Таксама ён паведаміў, што даты маніторынгаў пакуль невядомыя, іх плануецца правесці ў першым паўгоддзі.

У цэлым у Мінску ў 2014 годзе колькасць злачынстваў, учыненых падлеткамі, знізілася на 12,7% (з 536 да 468). Станоўчая тэндэнцыя захавалася і сёлета ў студзені. Разам з тым у 2014 годзе прыкметна павялічылася колькасць падлеткавых злачынстваў у Заводскім (з 47 да 67) і Кастрычніцкім (з 23 да 67) раёнах. Ва ўсіх раёнах сталіцы сярод непаўналетніх істотна ўзрасла колькасць злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў.

Больш за траціну злачынстваў у маладзёжным асяроддзі (37%) здзейсніў у перыяд з 16.00 да 22.00 гадзін. У пракуратуры гэта лічаць сведчаннем слабога кантролю з боку законных прадстаўнікоў падлеткаў і прабеламі ў арганізацыі іх занятасці ў вольны час.

На думку прадстаўнікоў пракуратуры, і супрацоўнікі інспекцый па справах непаўналетніх не вывучаюць у поўнай меры ўмовы выхавання і пражывання падлеткаў.

«Па-ранейшаму першачарговая ўвага надаецца часовым метадам прафілактыкі, якія носяць карны характар: выяўленню новых фактаў супрацьпраўных паводзін і прымяненню спагнанняў па іх, падрыхтоўцы дакументаў для накіравання ў спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы і г.д. Часта не прымаюцца да ўвагі прычыны і ўмовы супрацьпраўных паводзін непаўналетніх, не аналізуюцца вынікі прафілактычнага ўздзеяння і не індывідуалізуюцца метады выхаваўчай працы з канкрэтным праваправарушальнікам», — адзначаюць у пракуратуры.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК** ■



«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «ПРАПАНАВАЛІ ПАМЯНЯЦЬ ПОЎНЫ ГАЗАВЫ БАЛОН НА... ПОЎНЫ»

**З вёскі Слабада Лагойскага раёна патэлефанавала са сваім клопатам Святлана Сяргееўна Кульша. Прасіла дапамагчы разабрацца, чаму газавікі, якія прывезлі замоўлены новы газавы балон, адмовіліся забраць пусты, а прапанавалі адключыць... поўны, каб замест яго ўстанавіць такі ж паўнюткі.**

— Дагэтуль тыя ж газавікі мянялі нам балон у студзені. У тым жа месяцы мой муж прайшоў інструктаж і атрымаў пасведчанне на права самастойнай замены газавых балонаў. Што ён і зрабіў ужо сам у лютым, калі папярэдні скончыўся. Днямі мы зноў замовілі балон, яго прывезлі, але мяняць на пусты адмовіліся. Сказалі, што могуць толькі зняць падключаны мужам і паставіць новы. Прычынай назвалі тое, што быццам бы памяняліся правілы ў дачыненні інструктажу наконт самастойнай замены газавых балонаў, — распавяла пра сутнасць праблемы заяўніца.

Па каментарыі мы звярнуліся ў Лагойскае раённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі «Лагойскрайгаз». Вось што нам паведаміла начальнік службы эксплуатацыі прадпрыемства Вольга Чарнуха, папярэдне праверыўшы выкладзеную жыхаркай вёскі Сладаба інфармацыю.

— Сапраўды, нашы работнікі былі па ўказаным адрасе, але новы газавы балон вяскоўцам не аддалі. Справа ў тым, што яшчэ ў снежні 2013 года ўступілі ў сілу новыя правілы карыстання газам у быце. У іх ёсць адзін пункт, які забараняе захаванне ў непадключаным стане газавых балонаў, нават пустых (яны ўсё роўна знаходзяцца пад ціскам). У заяўнікаў была менавіта такая сітуацыя: калі побач знаходзіліся падключаны поўны балон і пусты. Таму нашы работнікі маглі памяняць толькі той з іх, які быў падключаны, — патлумачыла Вольга Валер'еўна.

Па яе словах, атрыманае мужам заяўніцы пасведчанне на права самастойнай замены балонаў дазваляе рабіць гэта толькі ў тым выпадку, калі вяскоўцы самі будуць дастаўляць іх з пункта абмену, які размешчаны на аўтагазазапраўцы і належыць гаргазу. Калі прывозіць балоны будуць газавікі, значыць, і мяняць іх, згодна з вышэйназванымі новымі правіламі, маюць права толькі яны. Выходзіць, што на гэтую акалічнасць нашы заяўнікі не звярнулі ўвагі? Інакш які быў сэнс атрымліваць тое пасведчанне, калі яны па-ранейшаму збіраліся карыстацца паслугамі газавікоў па дастаўцы?

Можа ўзнікнуць пытанне: чаму, калі новыя правілы карыстання газам у быце ўступілі ў сілу яшчэ ў снежні 2013 года, нашы заяўнікі даведаліся пра іх фактычна толькі цяпер? Вольга Чарнуха сказала, што насельніцтва ў свой час інфармавалася пра змены праз мясцовую газету. Больш за тое, праводзілі праверкі населеных пунктаў і чарговыя якраз нядаўна дайшла да Слабады.

Ці ёсць выйсце з сітуацыі для сям'і нашых заяўнікаў? Трэба падключыць праз рэдуктар адразу два балоны, і тады замену аднаго з іх будуць выконваць спецыялісты. Або, як заўважалася вышэй, самастойна прывозіць іх з пункта абмену, які належыць гаргазу і размешчаны на аўтагазазапраўцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Дзяўчынку шукалі, а яна... каталася ў метро

**У Маскоўскі РУУС сталіцы паступіла інфармацыя пра вышук зніклай 10-гадовай дзяўчынкі.**

Была даследавана ўся прылеглая да адрасу пражывання дзяўчынкі тэрыторыя, школа, дзе яна вучылася, у сацыяльных сетках «адпрацаваны» ўсе яе сябры і сяброўкі. А непаўналетняя ў гэты час... каталася ў метро.

Высветлілася, што напярэдадні дзяўчынка атрымала ў школе незадавальняльную адзнакі, таму, па яе прызнанні, моцна расстроілася і вырашыла пайсці з дому. Ранкам, калі бацькі яшчэ спалі, школьніца выйшла з кватэры. Дабраўшыся да метро, некаторы час яна каталася ад станцыі да станцыі, пакуль не зразумела, што заблукала. Апынуўшыся на «Партызанскай», дзяўчынка прыгадала, што непадалёку на вуліцы Пляханава жыве яе дзядзька. Яна пацікавілася ў мінакоў, як знайсці патрэбны адрас, і накіравалася да сваяка. У яго «падарожніцу» і забралі бацькі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**Информация участникам аукционов!** УНП 400251518

**В аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле, назначенный на 8 апреля 2015 г., проводимый Гомельским городским исполнительным комитетом**

**ВНОСИТСЯ ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ ИНФОРМАЦИЯ.**

**Изменилось время приема заявок** для участия в аукционе: заявки для участия в аукционе принимаются в каб. 115 Гомельского горисполкома (ул. Советская, 16) по понедельникам с **11.00 до 13.00 по 6 апреля 2015 г. включительно.**

Дополнительная информация по телефонам 77-69-35, 77-67-27.

■ Узяць вышыню

# ХМАРАЧОС ПАД НАГЛЯДАМ

## Навукоўцы прадэманстравалі, як працуе айчынная сістэма маніторынгу канструкцый вышынных і ўнікальных будынкаў



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Сучаснае будаўніцтва вымагае сур'ёзнай разумовай працы не толькі ад праекціроўшчыкаў, але і ад эксплуатуючых арганізацый. Хмарачосы, унікальныя складаныя канструкцыі — ледзь не кожны год б'юцца сусветныя і рэгіянальныя рэкорды па вышыні і іншых параметрах будынкаў. Аднак складаныя пабудовы патрабуюць не менш складаных сістэм маніторынгу і аховы бяспекі. Аварыйныя сітуацыі і надзвычайныя выпадкі выклікаюць, пэўна, нават больш рэзананс, чым з'яўленне новых арыгінальных будынкаў. Калі ў вядучых краінах свету сістэмы назірання за станам будынкаў — з'ява не новая, то ў нас аналагічных распрацоўкі з'явіліся адносна нядаўна. Працу гатовай сістэмы маніторынгу айчыннай вытворчасці журналістам прадэманстравалі на прыкладзе хмарачоса «Ветразь», што знаходзіцца ў сталіцы.**

Мерапрыемства адбывалася на першым паверсе яшчэ нездадзенага ў эксплуатацыю вышыннага будынка «Ветразь», што ўваходзіць у склад шматфункцыянальнага бізнес-цэнтра. Прэзентацыю сістэмы маніторынгу **прафесар Валерый ВЕНГРЫНОВІЧ, загадчык лабараторыі вылічальнай дыягностыкі Інстытута прыкладной фізікі НАН,** праводзіў фактычна ў «палявых умовах» — у пакоі без аддзелкі пад шум перфаратараў і малаткоў. У якасці слухачоў, акрамя журналістаў, — кіраўнікі самых розных будаўнічых арганізацый.



Як працуе сістэма маніторынгу, створаная ў Беларусі? На паверхню ці нават унутр будаўнічых канструкцый (каркас, нясучыя канструкцыі) устанаўліваюцца датчыкі, якія фіксуюць такія фізічныя паказчыкі, як вугал ухілу, ціск, паскарэнне, узровень вібрацыі і іншыя. Напрыклад, у «Ветразі» такіх датчыкаў 118. Усе даныя перадаюцца на апрацоўку ў адзіны вузел, і аператар можа пабачыць іх змяненні на працягу ўсяго часу фіксавання. Такім чынам, сістэма дазваляе папярэдзіць магчымую аварыйную сітуацыю, а таксама даведацца, якія часткі канструкцыі маюць патрэбу ва ўмацаванні ці рамонце. Айчынная сістэма ўжо ўсталявана і эксплуатуецца на такіх будынках, як «Мінск-Арэна», «Чыжоўка-Арэна», у вучэбна-трэніровачным цэнтры фрыстайла, мінскім аквапарку і іншых.

Пытаемся, ці адрозніваецца нечым беларуская сістэма ад сваіх замежных аналагаў.

— Галоўнае, у чым мы спрабуем прасунуцца далей за замежнікаў — вырашэнне некаторых фундаментальных праблем у сістэмах маніторынгу, — расказаў Валерый Венгрыновіч. — Першая — як найбольш аптымальна выбраць датчыкі і як іх расставіць па канструкцыі. Мы хочам пры мінімальнай колькасці затрат атрымаць максімальную колькасць інфармацыі. Другая праблема — як аналізаваць тыя даныя, што мы маем на выхадзе. Цяжка нават уявіць, які масіў лічбаў перадаюць на апрацоўку ўсе датчыкі. Трэба сказаць, што ў вырашэнні гэтых праблем мы ўжо дасягнулі пэўных поспехаў. Акрамя таго, усе датчыкі — нашай, уласнай вытворчасці. Іх якасць не пакідае пытанняў, тыя ж інклінометры (датчыкі вугла ўхілу. — **Аўт.**) на ўзроўні найлепшых у свеце. Мы, зразумела, можам запрасіць якую-небудзь амерыканскую кампанію, што займаецца будаўнічым маніторынгам, каб яна ўсталявала сваю сістэму. Але, па-першае, гэта будзе каштаваць разоў у пяць даражэй, а, па-другое, я лічу, што сістэму бяспекі нельга аддаваць у чужыя рукі.

Пераходзім ад тэорыі да практыкі — заглядваем у пакой, куды «сцякаецца» ўся інфармацыя з датчыкаў. Яна апрацоўваецца звычайным персанальным камп'ютарам. «Экскурсію» праводзіць **Валерый ЦУКЕРМАН *(на фота)*, загадчык канструктарска-тэхналагічнага аддзела Інстытута прыкладной фізікі НАН.** На маніторы ў рэжыме рэальнага часу схематычна адлюстроўваюцца ўсе датчыкі, устаноўленыя ў «Ветразі». За некалькі «клікаў» мышкай можна перайсці да любога з іх, прагледзець гісторыю змяненняў, вывесці на экран графікі і многае іншае. Запісы вядуцца на працягу ўсяго перыяду існавання будынка. Калі трэба — можна атрымаць усе звесткі за пэўны дзень любога года.

Па словах Валерыя Цукермана, сістэма не патрабуе абавязковага пастаяннага кантролю з боку аператара. Напрыклад, калі эксплуатацыйная арганізацыя вырашыць, што штодзённае назіранне не апраўдана, можна пакінуць сістэму без нагляду. Яна аўтаматычна папярэдзіць аператара аб збоях у датчыках, небяспечнай або аварыйнай сітуацыі дыстанцыйна — праз інтэрнэт. Сістэма распавядзе пра магчымыя прычыны здарэння, а таксама дасць рэкамендацыі персаналу будынка. Дарэчы, гэтак жа дыстанцыйна ёсць магчымасць атрымліваць усе паказчыкі з датчыкаў. Што цікава, распрацоўка можа манціравацца не толькі ў працэсе ўзвядзення будынка, але і пры поўнай яго гатоўнасці. Такі падыход ужо выкарыстоўваўся, напрыклад, у сталічным аквапарку.

— Наш праект — яскравы прыклад навукова-тэхнічнай распрацоўкі, якая не засталася на паперы, у справаздачы ці на макеце, а рэальна выкарыстоўваецца на знакавых для краіны збудаваннях, — сказаў **Раман ШУЛЯКОЎСКІ, дырэктар Інстытута прыкладной фізікі НАН.** — На распрацоўку спатрэбілася прыкладна 3-4 гады, і цяпер мы вельмі задаволеныя вынікамі.

Напрыканцы прэзентацыі Валерый Венгрыновіч звярнуў увагу журналістаў на пэўныя недахопы, што існуюць у беларускім заканадаўстве датычна сістэм маніторынгу. У нашай краіне неабходнасць іх устаноўкі амаль ніяк не рэгламентуецца — яны патрабуюцца на офісных збудаваннях, вышэйшых за 50 метраў, і на жылых дамах, вышэйшых за 75 метраў. Па меркаванні навукоўца, гэта вялікі недахоп. Напрыклад, у Казахстане заканадаўства абавязвае забудоўшчыка ўстанаўліваць сістэмы маніторынгу на любых будынках, вышэйшых за 50 метраў, на ўсіх мастах і ў збудаваннях, дзе пастаянна знаходзіцца шмат людзей (у супермаркетах і г.д.).

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «АДПАЧНЁМ НА ПРЫРОДЗЕ СА «ЗВЯЗДОЮ»!»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай "Адпачнём на прыродзе са «Звяздою»!" (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 14 сакавіка па 30 чэрвеня 2015 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал і першае паўгоддзе 2015 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд гульні сфарміраваны за кошт маёмасці яе арганізатара — Установы — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Барбекю Sundays ZD-801, Кітай | 1 | 2 416 000 | 2 416 000 |
| 2. | Знішчальнік насякомых KomarOFF, Кітай | 7 | 768 000 | 5 376 000 |

УСЯГО прызавы фонд Гульні складае 7 792 000 (сем мільёнаў семсот дзевяноста дзве тысячы) беларускіх рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Гульня праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету "Звязда" на другі квартал і першае паўгоддзе 2015 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал і першае паўгоддзе 2015 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 14 сакавіка па 14 красавіка 2015 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 14 сакавіка па 11 красавіка 2015 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, што даслӑў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ва Установу пасля 14 красавіка 2015 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Адпачнём на прыродзе са «Звяздою»!» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і перспектыўных праектаў рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 15 красавіка 2015 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца па адным знішчальніку насякомых.

Потым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — барбекю.

14. Пераможцам Гульні, што выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 красавіка 2015 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 красавіка 2015 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'ўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 2 квартал або першае паўгоддзе 2015 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 2 квартал або першае паўгоддзе 2015 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 2 квартал або першае паўгоддзе 2015 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 чэрвеня 2015 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2015 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення Гульні да яе пачатку будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія тычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне: (017) 287 18 38.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні №2522 ад 11.03.2015 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Святлана СТАЦЭНКА:

# «ШТО Б НІ ЗДАРЫЛАСЯ, ПАДЫМАЮСЯ І ІДУ ДАЛЕЙ»

**Яна з тых жанчын, якія спалучаюць у сабе сілу характару, мудрасць і прыгажосць. У педагогіку прыйшла, можна сказаць, па волі лёсу. Бо мара стаць выкладчыкам спачатку ўзнікла ад жадання быць справядлівай, а з часам гэты шлях стаў свядомым і неабходным выбарам любячай жанчыны і маці. Аднак, мабыць, усё было не выпадкова, таму што сёння Святлана Стацэнка — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя У. Мулявіна, заслужаны дзеяч культуры Беларусі і музычны кіраўнік тэлепраекта «Я спяваю!», што вось ужо 5 гадоў праводзіць тэлеканал АНТ. Падчас размовы з нашай гераіняй мы паспрабавалі даведацца, каму Святлана Адамаўна прысвячае свае перамогі, якой тактыкі прытрымліваецца ў выкладанні і што сёння для яе ў прыярытэце.**

## СІЛА ВА ЎМЕННІ ПАСТАЯЦЬ ЗА СЯБЕ

*Сустрэча адбылася пасля Міжнароднага дня жанчын у студыі Нацыянальнага музычнага цэнтра... Шматлікія дыпломы вучняў на сценах разам з букетамі кветак ад іх жа і даюць адказ на пытанне, што такое паспяховы выкладчык. Таму цікаўлюся іншым: ці лёгка быць жанчынай у наш час?*

— Гэта цяжка, але пачэсна. Бо трэба сумяшчаць выхаванне дзяцей і працу. Калі мае дочкі былі малодшага ўзросту, то зведала на сабе, як бывае не проста, і не толькі ў эмацыянальным плане, але і фінансава. Зараз ужо кожная з іх можа самастойна са сваімі праблемамі спраўляцца, таму з'явілася магчымасць больш часу аддаваць творчасці, працы. Але ж, вяртаючыся дадому, трэба і мужу прыгатаваць нешта смачнае, і прыбраць... Абавязкаў гаспадыні ніхто не адмяняў. Мой муж часам кажа, што сядзець дома і займацца толькі сям'ёй і сабой я не змагла б, і ў пэўным сэнсе ён мае рацыю. Хаця ёсць шмат прыкладаў, калі жанчыне дастаткова і гэтага. У маім атачэнні жанчыны самадастатковыя і паспяваюць многае. Хочацца не проста пражыць жыццё, але і нешта пакінуць пасля сябе, быць карыснай для грамадства. Вось і працуем.

**— Вас можна смела аднесці да ліку жанчын, пра якіх кажуць «зрабіла сябе сама». Калі ў свой час вы вырашылі звязаць сваё жыццё з музыкай, то маглі ўявіць, што ўсё складзецца менавіта так?**

— Я зрабіла сябе сама, таму што ў дзяцінстве цяжка жыла. Мая мама адна выхоўвала траіх дзяцей. Я разумею, што такое даесці да канца, і дагэтуль не магу ні кавалачка хлеба выкінуць, бо ведаю, як маці яго зараблялa. І калі б мне, дзевяцігадовай дзяўчынцы, тады сказалі, што я буду заслужаным дзеячам культуры ў нашай краіне, то, мабыць, усміхнулася б... У мяне ніколі не было мэты некага з сябе строіць. Заўсёды і зараз даказваю ўсё толькі сабе. Не з тым пасылам, што вось давайце зробім так, каб усеападалі. Я наогул лічу, калі людзі так робяць, то яны пакрыўджаныя знутры. У мяне дастаткова моцны характар, таму ніколі не кідала пачатай справы, а казала: «Давай! Няўжо слабо?»

**Зараз з пакалення ў пакаленне ўзровень прафесіяналізму сярод выкладчыкаў зніжаецца. Найлепшыя часта наогул з прафесіі сыходзяць, шукаючы месца з больш высокім заробкам.**

Падвозім жанчын дадому і спяшаемся далей. У дарозе распытваем кіроўцу пра кліентаў. Бясплатна сацыяльнае таксі прадастаўляецца інвалідам 1-й групы, калясачнікам, дзецям-інвалідам да 18 гадоў, інвалідам 2-й групы старэйшым за 70 гадоў, якія не працуюць і чыя пенсія не перавышае паўтара бюджэту пражытачнага мінімуму. Пенсіянеры за 70 з другой групай інваліднасці, што атрымліваюць больш за паўтара БПМ, таксама могуць карыстацца спецыяльным транспартам, але за грошы. Для іх адна паездка каштуе 27 тысяч рублёў. Юрый Іванавіч кажа, што працэнтаў 90 пасажыраў — пастаянныя. У апошні год, праўда, з'явілася шмат хворых з анкалогіяй. Часцей за ўсё таксі замаўляюць інваліды, у якіх непрацуюць ныркі. Ім тры разы на тыдзень трэба на гемадыяліз у бальніцу.

За дзень машына абслугоўвае 10-15 заказаў. У будні большасць паездак — ва ўстановы аховы здароўя. На выхадныя — у царкву ці на могілкі. Есць і «асаблівыя» пасажыры.

— У пяціпавярховіку жыве адзінокая бабуля з трыма-чатырма катамі. Сама ледзь ходзіць, але пастаянна судзіцца. Возім яе па пракуратурах, — усміхаецца Юрый Іванавіч.

Некаторыя дзеці-інваліды ездзяць на конную тэрапію. Аздараўленчыя заняткі з дэльфінамі, якія раней былі папулярныя, цяпер карыстаюцца меншым попытам. Ці то каштуюць дорага, ці то менш эфектыўныя. Яшчэ адну жанчыну на калясцы два разы на тыдзень возяць у спартыўны цэнтр Максіма Мірнага, дзе яна займаецца вялікім тэнісам. А вось баскетбалісты-калясачнікі сацыяльнае таксі замаўляюць рэдка. «Там хлопцы здаровыя, усе на сваіх машынах, самі за рулём, — кажа наш кіроўца. — Кожны дзень на трэніроўцы па 5-10 кіламетраў намотваюць. Бачыў неяк іх баскетбольны матч. Спартсмены такія піруэты на калясках робяць!»



**Пасажыры сацыяльнага таксі вельмі ўдзячны за такую паслугу: ім складана ездзіць грамадскім транспартам.**

## ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ ІНСУЛЬТУ

Па наступным адрасе таксі чакае бабуля Алена з маленькай унучкай. У пяцігадовай Ангеліны, якая старанна штурхае наперад звычайную калыску і, абапіраючыся на яе, спрабуе ісці самастойна, — ДЦП. Малую трэба адвезці на Севастопальскую, у Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў. З дапамогай пад'ёмніка Ангеліна трапляе ў салон машыны.

— Ці заўважны паляпшэнні пасля заняткаў па рэабілітацыі? — пытаю ў жанчыны.

— Безумоўна. Бачыце, унучка цяпер ходзіць больш-менш нармальна. Раней толькі на пальчыках магла стаяць.

Алена даглядае дзяўчынку адна: маці Ангеліны памерла. Пакуль едзем да цэнтра, малая збянтэжана ўсміхаецца і ціха расказвае штосьці бабулі. Ужо выходзячы з машыны, жанчына раптам насцярожылася: няўжо сацыяльнае таксі збіраецца адмяніць? Напэўна, таму журналісты і зацікавіліся гэтай паслугай. І толькі калі пачула, што таксі будзе працаваць, як і раней, баба Лена павяла ўнучку на рэабілітацыйныя заняткі.

А мы тым часам выпраўляемся ў Бараўляны. Там са шпіталя выпісалася пажылая пара. Фёдар Дзям'янавіч 6 гадоў таму перанёс інсульт, правы бок цалкам паралізаваны. Два-тры разы на год пенсіянера змяшчаюць у бальніцу на рэабілітацыю. Жонка Зоя Мікалаеўна, інвалід 2-й групы, звычайна кладзецца на абследаванне разам з ім, каб і самой падлячыцца, і мужа даглядаць.

**Аздараўленчыя заняткі з дэльфінамі, якія раней былі папулярныя, цяпер карыстаюцца меншым попытам. Ці то каштуюць дорага, ці то менш эфектыўныя.**

— Ён ужо і размаўляць пасля інсульту пачаў, і чытаць навучыўся. Мы па вечарах па дзіцячай чытанцы займаемся. А да хваробы муж выкладчыкам працаваў, вершы нават пісаў, — уздыхае жанчына.

— Дома вас дзеці, напэўна, чакаюць?

— Агульных дзяцей у нас няма. Мая дачка стараецца нас наведваць, а дачка мужа ўжо даўно не тэлефануе...

## З ДЗІЦЯЧАГА ЛАГЕРА — У РЭАНІМАЦЫЮ

— Зараз едзем забіраць маці з сынам, — звяртаецца да мяне кіроўца. — Хлопца ў псіханеўралагічны інтэрнат трэба адвезці.

Гісторыя 20-гадовага Жэні, на жаль, мала падобна да жыцця звычайнага юнака. У хлопца з дзяцінства была затрымка ў развіцці. З ім займаліся спецыялісты, дапамагалі адаптавацца, і ўсё было быццам бы не так страшна. А потым Жэня паехаў адпачываць у лагер, дзе яго ледзь не да смерці збілі старэйшыя хлопцы. Два месяцы дзіця праляжала ў рэанімацыі. Траўмаваную псіхіку вылечыць так і не змаглі. Цяпер у будні хлопец жыве ў інтэрнаце, а на выхадныя маці забірае яго да сябе.

— Раней, каб дабрацца з сынам да Нявінак, замаўляла звычайнае таксі, — кажа Тацяна. — Самі разумееце: ездзіць так два разы на тыдзень абыходзіцца ў значную суму. Таму я вельмі ўдзячна за такую паслугу, як сацыяльнае таксі. А Юрый — адзін з найлепшых кіроўцаў. Ніколі не спазняецца, уважліва ставіцца да нас.

Юрый Іванавіч развозіць інвалідаў ужо чатыры гады. Дагэтуль працаваў кіроўцам аўтобуса, а яшчэ раней — зубным тэхнікам. Медык па адукацыі, мужчына 12 гадоў вырабляў зубныя пратэзы (пэўны час нават загадваў артапедычным аддзяленнем адной са стаматалагічных паліклінік Мінска), але потым ад прафесіі прыйшлося адмовіцца, каб пабергчы зрок. Пастаянных пасажыраў Юрый Іванавіч ведае не толькі па імёнах. Ён добра знаёмы з гісторыяй кожнага:

— Тут у раёне жыве малады інвалід-калясачнік Паша, яму гадоў 28. Маці з бацькам ад хлопца адмовіліся, яго даглядаюць цётка з дзядзькам. У Пашы толькі адна рука працуе, але колькі ў яго энергіі! Наведвае ўсе канцэрты, куды можна дастаць квіткі. У двары хлопца добра ведаюць, дапамагаюць дакаціцца да машыны. Паўлік заўсёды загадзя выходзіць. Аўто замоўлена на палову дзясятай, а ён ужо ў 9 гадзін на вуліцы. Стараюся яго раней забраць, каб не мёрз. У Паўліка і мой асабісты нумар ёсць, тэлефануе часам, каб пагутарыць.

Таксі нездарма назвалі сацыяльным. І не толькі таму, што яно разлічана на ўразлівую катэгорыю грамадзян. Паслуга робіць горад і зносіны з іншымі людзьмі больш даступнымі для інвалідаў. А для некаторых сацыяльнае таксі — адзіны шанц вырвацца да жыцця, што кіпіць па-за межамі кватэры.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Зоя Мікалаеўна і Фёдар Дзям'янавіч збіраюцца дадому.**

фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Штомесяц у тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна паступае каля 800 заявак на сацыяльнае таксі. Машыну замаўляюць звычайна за два тыдні. У госці і на лецішчы таксі не возіць. Абмежаваны і паездкі ў краму ці на рынак — да двух рэйсаў у месяц. Аднак, па словах дырэктара Алены СВІРЫД, бываюць выпадкі, калі пасажыры злоўжываюць сацыяльнай паслугай:**

**— Напрыклад, чалавек ведае, што ў бацькоўскім доме знаходзіцца аддзяленне банка і замаўляе таксі нібыта ў банк. А потым кіроўца бачыць, як інваліда завялі ў іншы пад'езд. Ці можа высветліцца, што названае аддзяленне ў той дзень увогуле не працуе. Дый падманшчыкі звычайна самі сябе выдаюць нахабнымі паводзінамі. Візіты такіх людзей мы потым больш пільна адсочваем, аднак зрабіць ім нічога не можам. Не маем права адмовіць, калі заяўка афармлена правільна.**

■ Сітуацыя

# КАЛІ «ХАТА НЕ З КРАЮ»

## Жыхар Гродна да прыезду супрацоўнікаў ДАІ затрымаў п'янага кіроўцу

У той дзень Аляксандр ехаў па Індурскай шашы абласнога цэнтра і раптам заўважыў неадэкватныя дзеянні аднаго з кіроўцаў, чыя «Мазда» беспрычынна мяняла дарожныя палосы. Больш за тое, падчас аднаго з такіх манеўраў перад уездам на кальцавую развязку гэтая іншамарка «падрэзала» мікрааўтобус, а потым накіравалася да аднаго з гіпермаркетаў. Аляксандр — за ёй. Дзве машыны спыніліся там на паркоўцы. З крамы кіроўца «Мазды» выйшаў з бутэлькай шампанскага і няцвёрдай паходкай накіраваўся да сваіх «колаў».

— Як жа вы ў такім стане паедзеце? — запытаўся ў яго Аляксандр.

Адказ проста збянтэжыў:

— Так, я п'яны. Але мне трэба праехаць усяго 100 метраў.

**ДА ТЭМЫ:**

**Людзі, якія дазваляюць сабе сесці за руль у нецвярозым стане, караюцца цяпер па ўсёй строгасці закона. Вось, напрыклад, якія санкцыі прымяніў да аднаго з іх суд Ленінскага раёна Гродна. У 2012 годзе «п'яная» паездка каштавала чалавеку буйнога штрафу і пазбаўлення права кіравання транспартнымі сродкамі на 5 гадоў. Не падзейнічала — арышт на 3 месяцы, штраф у памеры 150 базавых велічынь, канфіскацыя ў даход дзяржавы аўтамабіля, якім ён кіраваў, ды яшчэ прымусовае лячэнне ад алкагольнай залежнасці.**

Пасля чаго нецвярозы сеў за руль. Аднак тое, што ён натрапіў не на даішніка, а на звычайнага кіроўцу, не дапамагло яму пазбегнуць адказнасці. Бо Аляксандр тут жа патэлефанаваў па нумары «102», а сам накіраваўся за «Маздай», пры гэтым перадаючы інфармацыю аб маршруце руху ў дзяжурную часць ДАІ. Так працягвалася да таго моманту, пакуль п'яны кіроўца не ўехаў у двор дома па вуліцы Гданьскай. І тут, нягледзячы на вышэйзгаданыя «усяго 100 метраў», не абышлося без здарэння: «Мазда», здаючы назад, ударыла «Опель», які знаходзіўся на стаянцы. А што ж вінаўнік аварыі? Можа, збянтэжыўся, што прычыніў шкоду іншаму чалавеку? Не, ён выйшаў са сваёй машыны і накіраваўся дахаты. Аднак Аляксандр перагарадзіў яму шлях сваім мікрааўтобусам. Якраз у гэты момант прыбыў нарад Дзяржаўтаінспекцыі. Застолле з шампанскім было адменена. А медыцынская экспертыза паказала, што ўтрыманне алкаголю ў арганізме затрыманага больш чым у 7 разоў перавышала максімальна дапушчальнае.

Вось такая сітуацыя, у якой адзін чалавек груба ігнаруе нормы жыцця ў грамадстве, а другі лічыць сваім чалавечым абавязкам спыніць хама. Нічога надзвычайнага, ніякага гераізму — толькі разуменне, што інакш проста не павінна быць. Каб гэтае хамства не стварала небяспеку для ўсіх людзей, у тым ліку і дзвюх дачок Аляксандра. Гэта не гучныя словы. Бо колькі ўжо здарылася трагедый, калі п'яныя кіроўцы выязджаюць на дарогі і становяцца не проста парушальнікамі правілаў — забойцамі. Хаця іх хтосьці, пэўна, бачыў да ракавых наступстваў гэтых злачынстваў. Але не паспрабаваў спыніць, палічыў, што «мая хата з краю».

Гэта тычыцца не толькі працэдзяння п'яным кіроўцам. На жаль, і ў іншых сітуацыях у нас часта няма жадання рэагаваць на хамства так, як Аляксандр. І сваю абыякавасць заўсёды, безумоўна, можна чымсьці апраўдаць. Напрыклад, «няхай разбіраецца той, хто павінен па абавязку службы», ці «ў мяне свае праблемы, няма часу на іншае» альбо «не хачу кагосьці «закладваць». Такіх «прагматыкаў» нямала. Але, на шчасце, ёсць і іншыя жыццёвыя прынцыпы.

Праз некалькі дзён пасля таго, як Аляксандр не дазволіў застаца беспакараным п'янаму кіроўцу, у Гродне затрымалі чарговага парушальніка — 24-гадовага дарожнага рабочага. Са сваім знаёмым ён ездзіў у краму па гарэлку... на экскаватары, не маючы нават права кіраваць гэтым транспартным сродкам. У ДАІ паступіў званок ад чалавека, які ўбачыў моцна нецвярозага маладога чалавека, што потым і пацвердзілася. А неўзабаве, зноў жа дзякуючы паведамленню неабыякавага чалавека, нарад Дзяржаўтаінспекцыі спыніў яшчэ аднаго п'янага кіроўцу.

Дарэчы, дзеянні Аляксандра атрымалі аднадушную падтрымку ў водгуках на сайце Гродзенскай абласной ДАІ:

— Правільна зрабіў, сапраўдны Чалавек!

— Нізкі табе паклон і ўдзячнасць за гэты ўчынак. Я вельмі добра ведаю, што такое смерць дзіцяці...

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

ДАРЭЧЫ

# Да каго прыйдуць суправаджальнікі ды асістэнты?

**Атрымальнікаў бясплатных сацыяльных паслуг стане больш. Аб гэтым гаворыцца ў паведамленні прэс-службы беларускага ўрада.**

Паслугі памочніка па суправаджэнні цяпер будуць аказвацца інвалідам I групы не толькі з парушэннем апорна-рухальнага апарату, але і па зроку. Калі раней паслугамі асістэнта маглі скарыстацца адзінокія (або тыя, што пражываюць адзінока) інваліды першай групы з разумовымі парушэннямі, то цяпер яны разлічаны і для другой. Калі ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід, няня будзе даглядаць яго да паўналецця. Раней жа гэта рабілася, пакуль малому не спаўнялася чатыры гады.

Акрамя таго, сістэматызаваны пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання. Сярод іх — прыбіранне жылых памяшканняў, арганізацыя і правядзенне заняткаў па аднаўленні або развіцці сацыяльных навыкаў, арганізацыя гарачага харчавання дома. Для людзей, якія маюць у іх патрэбу, прадугледжаны адпаведныя нормы і нарматывы. «Разнабой» падыходаў пры аказанні паслуг у розных установах сацыяльнага абслугоўвання знікне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2014 год

# ОАО НЕРУДПРОМ

220024, г. Минск, ул. Асаналиева, 72, тел. (8-017) 365-66-07, УНН 100016844
Директор Лойко Александр Анатольевич
Главный бухгалтер Шимко Инна Васильевна

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 года

млн руб.

| АКТИВ | Код стр. | На 31 декабря 2014 г. | На 31 декабря 2013 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства (остаточная стоимость) | 110 | 103762 | 105013 |
| Нематериальные активы (остаточная стоимость) | 120 | 11 | 24 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 35 | 2593 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 39 | 39 |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **103847** | **107669** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 14193 | 15276 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 364 | 90 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1882 | 1927 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 634 | 2198 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 7786 | 6791 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 5112 | 3500 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 27967 | 17928 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 48 | 49 |
| **ИТОГО по подразделу II** | 290 | **57986** | **47759** |
| **БАЛАНС** | 300 | **161833** | **155428** |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 11391 | 11391 |
| Резервный капитал | 440 | 1158 | 1151 |
| Добавочный капитал | 450 | 87704 | 79701 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 12541 | 11940 |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | 112794 | 104183 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | - | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 12323 | 23602 |
| Резервы предстоящих расходов | 660 | 36716 | 27643 |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | **49039** | **51245** |
| **БАЛАНС** | 700 | 161833 | **155428** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

млн руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код стр. | За январь–декабрь 2014 г. | За январь–декабрь 2013 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 154225 | 172175 |
| Себестоимость реализованной продукции, работ, услуг | 020 | 143282 | 155816 |
| Валовая прибыль | 030 | 10943 | 16359 |
| Управленческие расходы | 040 | (10719) | (9812) |
| Прибыль от реализации продукции, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 224 | 6547 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1419 | 1272 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (4811) | (2987) |
| Прибыль (убыток) по текущей деятельности (060+070-080) | 090 | (3168) | 4832 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 5143 | 3408 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (445) | (415) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 2 | 52 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (-) | (358) |
| **Прибыль от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130)** | 140 | 4700 | 2687 |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения (-+090+-140)** | 150 | 1532 | 7519 |
| Налог на прибыль | 170 | (695) | (1661) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (49) | (844) |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ** | 210 | 788 | 5014 |

### ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

| Наименование показателя | Ед. изм. | За январь–декабрь 2014 г. | За январь–декабрь 2013 г. |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров – всего | Лиц | 2670 | |
| В том числе: юридических лиц<br>Физических лиц | Лиц<br>Лиц | 2<br>2668 | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | Млн руб. | 635,08 | 1561,56 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | Рублей | 4,906 | 12,06 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | Тыс. руб. | 0,80 | 0,83 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | Штук | 0 | 0 |
| Просроченная дебиторская задолженность | Млн руб. | 3365 | 1370 |
| Просроченная кредиторская задолженность | Млн руб. | 0 | 1284 |
| Среднесписочная численность работающих | Человек | 399 | |

**Дивиденды за 2014 год будут выплачиваться с 1 апреля 2015 по 15 мая 2015 года через кассу общества и карт-счета акционеров.**

---

УП «Институт «Белпромстройпроект»

## ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**ПО ВЫБОРУ СУБПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ ИНЖЕНЕРНО-ГЕОЛОГИЧЕСКИХ РАБОТ по объекту «Реконструкция здания специализированного розничной торговли» в г. Минске.**

Ориентировочные сроки выполнения работ — 10 календарных дней.

**Ориентировочная стоимость работ — 20 млн руб.**
**Срок представления предложений — 19.03.2015 г.**
**Фондеранцева Наталья Семеновна, тел. 8 017 200 28 30.**

УНП 100049147

---

белагропромбанк
традиции будущего

Дэпартамент па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ЗАРЭГІСТРАВАНА 09 сакавіка 2015 Прозвішча Сушко С.А. Подпіс

УТВЕРЖДЕНО
Протокол
Наблюдательного совета
ОАО «Белагропромбанк»
24.02.2015 № 5

Изменение в Проспект эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» сто шестьдесят девятого, сто семидесятого, сто семьдесят первого, сто семьдесят второго выпусков

В подпункте 2.6 пункта 2 Проспекта эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» сто шестьдесят девятого, сто семидесятого, сто семьдесят первого, сто семьдесят второго выпусков, утвержденного решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» 23.01.2014, протокол № 2, слова «дата окончания периода размещения облигаций – 26.03.2015» заменить словами «дата окончания периода размещения облигаций – 26.05.2015».

Заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк» — С.П.Чугай

Главный бухгалтер ОАО «Белагропромбанк» — М.А.Шаповалова

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136**
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **здание АБК** (инв. № 644/С-896) общ. пл. **636,7 кв.м;**
- **цех сборки с/х машин** (инв. № 644/С-37989) общ. пл. **798 кв.м;**
- **здание проходной** (инв. № 644/С-52678) общ. пл. **33.2 кв.м;**
- **здание весовой** (инв. № 644/С-52677) общ. пл. **41.8 кв.м;**
- **трансформаторная станция с воздушной и кабельной линиями** (инв. № 644/С-52750);
- **канализационная станция и канализационные сети** (инв. № 644/С-52754)**;**
- **противопожарная насосная станция с пожарным резервуаром для воды** (инв. № 644/С-52752);
- **площадка для хранения с/х машин** (инв. № 644/С -52753);
- **производственная площадка** (инв. № 644/С-52757);
- **дороги** (инв. № 644/С-52758);
- **водопровод** (инв. № 644/С-52775);
- **забор железобетонный** (инв. № 644/С-52774);
- **оборудование:** котел отопительный, бойлер, кран балка (3).

**Имущество расположено на зем. участке площадью 3,5418 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 43, Любанское шоссе.**

Недвижимое имущество обременено договорами аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 10 857 155 940 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 5%.**

**Задаток 5% от начальной цены (542 857 800 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 19.02.2015 г.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.03.2015** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.03.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Волковысский машиностроительный завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## изолированного помещения транспортного назначения (гараж),

**общей площадью 120,7 кв.м, инвентарный номер 410/D-22700, расположенного по адресу: г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31/ 5-2.**

**Начальная цена с НДС 20% – 165 000 000 бел. руб.**

**Задаток 10%** от начальной цены (16 500 000 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **3 (трех)** календарных дней после проведения аукциона. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, возмещения затрат на организацию аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **14.04.2015 в 14.00** по адресу: г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.04.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029-183-69-71.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

Приорбанк RZB Group

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество,**
*220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А,*

## ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ, что 24 марта 2015 года в 10.00 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА

Собрание состоится в г. Минске по адресу: пр. Победителей, 59, бизнес-центр гостиницы «Виктория».

Орган, созывающий собрание акционеров, – Наблюдательный совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, за 5 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО, по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Регистрация участников будет осуществляться 24 марта 2015 года с 8.45 до 9.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений об участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания и составления списка лиц, зарегистрировавшихся для участия в Собрании, содержащего подписи этих лиц.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

**Повестка дня Собрания:**

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2014 год
2. Отчет Правления о работе банка за 2014 год
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2014 год. Утверждение годового отчета за 2014 год: баланс банка, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств; распределение прибыли за 2014 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты
5. Внесение изменений в Устав «Приорбанк» ОАО
6. Внесение изменений в Положение о Наблюдательном Совете «Приорбанк» ОАО
7. Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного Совета, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей
8. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО
9. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО

*Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО.*

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

---

# И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 23 апреля 2015 года проводит 7-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 68 | Грузовой Урал-43202-01 ш. 038944 дв. 756570 1985 г. 4 кат. 39673 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 69 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 003150 дв. 735545 1985 г. 4 кат. 33728 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 70 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456447 дв. 789790 1982 г. 4 кат. 1699 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 71 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 016796 дв. 865497 1986 г. 4 кат. 84519 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 72 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 003849 дв.765984 1985 г. 4 кат. 43653 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 73 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0005675 дв. 0696993 1990 г. 4 кат. 62036 км | г. Ст. Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 74 | Кузов-фургон К.375 №03045 1980 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 262645 дв. 585553 1980 г. 3 кат. 1299 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 75 | Кузов-фургон К1.375 №11098 1984 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 430954 дв. 881095 1984 г. 3 кат. 1732 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 52 000 000 | 5 200 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **23 апреля 2015 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 часов 16 апреля 2015 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона**.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**

**Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

---

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 5»

**(г. Минск, ул. Широкая, 26)**
**ИЗВЕЩАЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ ПОВЕСТКИ ДНЯ очередного общего собрания акционеров ОАО «ДСТ № 5», проводимого 20 марта 2015 года в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал).**

В повестку дня очередного общего собрания акционеров ОАО «ДСТ № 5» вносится изменение путем дополнения девятым и десятым вопросами следующего содержания:

«9. Об утверждении локального нормативного правового акта – Положения о дивидендной политике ОАО «ДСТ № 5».

10. О рассмотрении отчета представителей управляющей компании в ОАО «ДСТ № 5» о расходовании в 2014 году средств от дивидендов по акциям, находящимся в хозяйственном ведении управляющей компании холдинга».

УНП 100219908 — *Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5»*

---

В связи с поступившим заявлением о признании безвестно отсутствующим ГУТАРОВИЧА Сергея Александровича, 1 октября 1981 года рождения, проживавшего в городе Минске по улице Алеся Бачило, дом 7, квартира 54, **суд Заводского района города Минска** обращается с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим сведениями о Гутаровиче Сергее Александровиче, сообщить их в суд Заводского района г. Минска по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 75а-32, в течение двух месяцев с момента публикации объявления.




## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.31 | 19.09 | 11.38 |
| Віцебск — | 7.21 | 18.58 | 11.37 |
| Магілёў — | 7.21 | 18.59 | 11.38 |
| Гомель — | 7.17 | 18.56 | 11.39 |
| Гродна — | 8.46 | 19.24 | 11.38 |
| Брэст — | 8.45 | 19.26 | 11.41 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 19.47.***
***Месяц у сузор'і Блізнят.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Марыны, Арсенія, Васілія, Івана, Мікалая.*
***К.*** *Бажэны, Хрысціны, Марка, Нікіфара.*



Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

## ЗАЎТРА




# Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ЗАРУЧЫНЫ. Звычайна праз тыдзень пасля сватаўства павінна была адбыцца не менш значная падзея — «заручыны».

◈ Калі сватаўство было пробным крокам у перадвясельных падзеях, то «заручыны» фактычна з'яўляліся першым адказным абрадам у аб'яднанні двух родаў. Асноўная мэта заручын («змовін», «вялікай гарэлкі», «вялікіх запоін», «ладу», «рукабіцця») была ў канчатковай дамоўленасці аб правядзенні вяселля, усіх яе абставінах, як эканамічных, так і абрадавых.

◈ На заручыны, якія адбываліся ў хаце нявесты, запрашалі больш шырокае кола сваякоў, што былі сведкамі перамоў і дасягнутай дамоўленасці. Удзельнікі гэтага абраду павінны былі больш дэталёва пазнаёміца з сем'ямі двух родаў; назваць асноўных удзельнікаў вяселля, тых, хто будзе надзелены вясельнымі чынамі (шафер, шаферка і г.д.); вызначыць колькасць гасцей з кожнага боку; колькасць сваякоў, якіх неабходна ўшанаваць падарункамі ў час вяселля; канчаткова выбраць дзень вяселля; прытрымліваючыся ўсіх правілаў народнай культуры, вызначыць тых, хто будзе пячы вясельны каравай; пагадзіцца на склад і колькасць пасагу; тут жа называўся дзень і час вянчання, памеры ахвяравання на храм, святару і іншым удзельнікам вянчання.

◈ З XVII-XVIII стст. абрад заручын заканчваўся тым, што жаніх і нявеста абменьваліся пярсцёнкамі і гэтым давалі згоду на шлюб. Пасля таго бацька нявесты звязваў рукі маладых са словамі: «Дай, Божа, у добры час, на вясёлае жыццё, на дзяцінае шчасце!»

◈ Адвячоркам радзіна нявесты і жаніха абменьваліся падарункамі. І далей адбываўся абрад развітання — госці павінны былі моцна пацісьнуць адзін аднаму рукі, быццам замацаваўшы атрыманую дамоўленасць.

◈ Пасля заручын адмовіцца ад вяселля было практычна немагчыма. І калі адзін з бакоў усё ж перадумваў, то на гэтую сям'ю накладалі штрафныя санкцыі на карысць пацярпелага боку. За вынаннем такіх жорсткіх патрабаванняў няўмольна назірала мясцовая грамадскасць.

◈ Трэба заўважыць, што ў розных рэгіёнах так званыя этапы «вясельных перамоў» маглі мець іншыя назвы і праводзіліся ў розны час. Але ўсе абрады, якія былі звязаны са сватаўством, заканчваліся за тыдзень перад вяселлем «дзявоцкім» і «хлапечым» вечарамі.

◈ На Беларусі грамадская думка высока ставіла тую дзяўчыну, да якой часцей ездзілі сваты. Лічылася, што нявеста, якую часта сватаюць, валодае вялікай колькасцю становучых якасцяў, з'яўляецца добрай гаспадыняй, майстрыхай і г.д. Ці за ёй будзе ладны пасаг. Але такія надзеі не заўсёды спраўджваліся. А ў народзе казалі: «З вялікага перабору ні лапцяў, ні абораў».

Даты | Падзеі | Людзі — **13 САКАВІКА**

**1881** год — бомба, кінутая нарадавольцам Ігнатам Грынявіцкім, павярнула кола гісторыі Расіі. Людзі, што абвясцілі сябе выразнікамі народнай волі, смяротна паранілі імператара Аляксандра II, якога звалі ў народзе «царом-вызваліцелем». Пры яго праўленні было скасавана прыгоннае права, уведзены ўсеагульны воінскі абавязак, створаны земствы, праведзена судовая рэформа, абмежавана цэнзура. Сабор Уваскрэсення Хрыстова ў Санкт-Пецярбургу (храм Спаса на крыві), пабудаваны на месцы трагедыі ў 1883-1907 гадах, увекавечыў памяць імператара Аляксандра II і яго рэфарматарскі курс.



**1898** год — 13—15 сакавіка ў Мінску праходзіў нелегальны Першы з'езд РСДРП, які абвясціў стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. З'езд праходзіў на кватэры сацыял-дэмакрата П.В. Румянцава. Прысутнічала 9 дэлегатаў ад шасці найбольш буйных сацыял-дэмакратычных арганізацый. Было праведзена 6 пасяджэнняў, запісваліся толькі рэзалюцыі. З'езд прыняў рашэнне аб'яднаць усе «Саюзы барацьбы», групу «Рабочей газеты» і Бунд у адну партыю. З'езд выбраў ЦК з трох членаў (С.І. Радчанка, Б.Л. Эйдэльман, А.І. Крэмер), прызнаў «Рабочую газету» афіцыйным органам партыі, вырашыў выпусціць Маніфест партыі. Маніфест РСДРП і рашэнні з'езда надрукаваныя ў красавіку 1898 года ў Бабруйску. Пасля з'езда сацыял-дэмакратычныя арганізацыі і саюзы сталі называцца камітэтамі РСДРП. Аднак партыя як адзіная сацыял-дэмакратычная арганізацыя не ўтварылася: не былі прыняты статут і праграма, пасля з'езда 8 з 9 дэлегатаў былі арыштаваны; друкарню «Рабочей газеты» разграміла паліцыя.

**1925** год — 90 гадоў таму нарадзіўся (вёска Дзямідавічы Дзяржынскага раёна) Аляксандр Уладзіміравіч Шот, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук (1964), прафесар (1967), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1977). У 1953 годзе скончыў Мінскі медыцынскі інстытут, з 1956-га — у Беларускім медыцынскім універсітэце. Аўтар навуковых прац па абдамінальнай і сардэчнай хірургіі, транспланталогіі, антыагеннаму сепсісу. Распрацаваў і ўкараніў у практыку пратэзаванне клапанаў аорты без адключэння сэрца ад кровазвароту. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

### Было сказана

**Алесь ЗВОНАК, паэт, драматург, перакладчык:**

*Багаты духам той, хто дорыць многа,*
*Убогі — хто не дорыць, а бярэ.*

## ■ Здарэнні

# КОТ БЫЎ ЦВЯРОЗЫ, РАНАК НЕ СОНЕЧНЫ

**Жыхарка Пружан ноччу вярталася з прыгараднай вёскі Засімавічы. На роўнай дарозе па вуліцы Леніна яна не справілася з кіраваннем і ўляцела ў агароджу прыватнага сектара. Паводле інфармацыі старшага інспектара Пружанскай ДПС Алега Краснакуцкага, у выніку дарожна-транспартнага здарэння знесена сем метраў агароджы. Аўтамабіль таксама моцна пашкоджаны.**

Калі ж супрацоўнікі міліцыі сталі высвятляць прычыну «манеўру», кіроўца ва ўсім стала вінаваціць ката, які нечакана выскачыў на дарогу. Каб не наехаць на жывёліну, яна і павярнула рэзка ўбок. Што возьмеш з ката? Ды ён у любым выпадку быў цвярозы, а вось у вадзіцеля экспертыза паказала 1,6 праміле алкаголю ў крыві.

А ў Брэсце інспектары звярнулі ўвагу, што жанчына ранкам, калі добра не развіднела, ехала ў цёмных акулярах. Калі яе спынілі і прапанавалі прайсці медыцынскі агляд, яна зачынілася ў машыне. Давялося прымяняць спецыяльныя сродкі, каб прымусіць кіроўцу выйсці з аўтамабіля. 45-гадовая жыхарка Кіева таксама аказалася нецвярозая.

**Яна СВЕТАВА**

## УСМІХНЕМСЯ

**Плыўчыха Юля, каб трэнер не заўважыў, што яна забыла шапачку для басейна, плавала без купальніка.**

**Чарапаха не бегае, не скача, не плавае, яна ледзь поўзае і — жыве 150 гадоў!**
**Выснова: ніякіх фізічных практыкаванняў, ніякай дыеты!**

Адэса, муж і жонка.
— Сара, золатка маё, ты куды збіраешся?
— Ды на Прывоз.
— Дык у нас такі ўсё ёсць!
— Ха! А пасварыцца?

— Забудзь усё, што паміж намі было.
— Я вас наогул не ведаю.
— А ты малайчына!

**Калі б хада была карысная для здароўя, паштальён быў бы бессмяротным.**
**Кіт цэлымі днямі плавае, есць толькі рыбу, п'е толькі ваду і — ён тоўсты!**
**Трус бегае і скача. Але жыве ён усяго 7—9 гадоў.**




Віншуем **старшыню СВК «Прыясельныя» Андрусевіча Віктара МІХАЙЛАВІЧА** з днём нараджэння. Жадаем і далей працаваць гэтак жа ініцыятыўна, адказна, з клопатам пра людзей і высокія ўраджаі!



**Праўленне і прафкам СВК, Іванаўскі раён.**

УНП 200074609

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.030. Індэкс 63850. Зак. № 1019.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 сакавіка 2015 года.